# Ogłoszenia parafialne

## XXXI

*31 października 2020*

## на нядзелю 1 XI 2020.

1. У панядзелак – Успамін усіх верных памерлых. Св. Імшы а 11.00 і а 19.00.
2. У сераду – успамін св. Караля Барамея, біскупа
3. У актаве Урачыстасці Усіх святых запрашаем на выпамінковае ружанцовае набажэнства, кожны дзень (2-8 лістапада) 45 мін перад св. Імшой.
4. **Сёлета ва ўмовах пандэміі COVID-19 магчымасць атрымання поўнага адпусту для памерлых вернікаў працягваецца на ўвесь месяц лістапад з дастасаваннем спраў і ўмоў для бяспекі вернікаў.**
    1. Поўны адпуст для тых, хто наведвае могілкі і моліцца за памерлых, прынамсі ў думках, устаноўлены на паасобныя дні з 1 па 8 лістапада, можа быць перанесены на іншыя восем дзён таго ж месяца да яго заканчэння. Гэтыя дні, якія вернікі дабравольна для сябе выбяруць, могуць быць таксама не паслядоўнымі адзін за другім.
    2. Поўны адпуст 2 лістапада, устаноўлены з нагоды ўспаміну Усіх памерлых вернікаў для тых, хто пабожна наведвае касцёл ці капліцу і там прамаўляе малітвы «Ойча наш» і «Веру», можа быць перанесены не толькі на папярэднюю або наступную нядзелю ці на ўрачыстасць Усіх Святых, але таксама на іншы дзень месяца лістапада паводле свабоднага выбару паасобных вернікаў.

Пажылыя, хворыя і ўсе тыя, хто па сур’ёзных прычынах не можа выходзіць з дома, напрыклад, з-за ўведзеных кампетэнтнымі ўладамі абмежаванняў на час пандэміі, каб пазбегнуць вялікага скаплення вернікаў у святынях, могуць атрымаць поўны адпуст, духоўна яднаючыся з усімі іншымі вернікамі і не маючы ніякай прывязанасці да граху, а таксама з намерам пры першай магчымасці выканаць тры звычайныя ўмовы (сакрамэнтальную споведзь, Эўхарыстычную Камунію і малітву ў інтэнцыях Святога Айца). Для гэтага ім неабходна памаліцца перад абразом Езуса або Найсвяцейшай Панны Марыі пабожнымі малітвамі за памерлых, напрыклад прамовіць Ютрань і Нешпары з Літургіі гадзінаў за памерлых, Ружанец, Вяночак да Божай міласэрнасці, іншыя малітвы за памерлых, блізкія вернікам, або пэўны час чытаць і разважаць над адным з урыўкаў з Евангелля, прапанаваных на літургію за памерлых, або зрабіць нейкі ўчынак міласэрнасці, ахвяруючы Богу боль і цяжкасці ўласнага жыцця.

5. Моладзь і дарослыя могуць запісацца ў канцылярыі на катэхезу да Сакрамэнту бежмавання, які можа прыняць асоба ахрышчаная і якая мае 14 год і больш.

6. У магазінчыку можна купіць малітоўнікі “Бог Добры” і календары на новы год.

7. Дзякую за складзеныя ахвяры на будову касцёла.